ВДУ

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

20 мая 2008 года, № 10 (1982)

ВЕДАЙ НАШЫХ!

МЕНДЗЯЛЕЕЎСКІ ПОСПЕХ

Вучні 11-га класа Ліцэя БДУ сталі прызёрамі 42-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіяды школьнікаў па хіміі, якая праходзіла з 28 красавіка па 4 мая ў Ташкенце (Узбекістан).

Павел Чулкін, Глеб Гарбацэвіч і Ганна Сіваплясава атрымалі залаты, срэбны і бронзавы медалі адпаведна. Акрамя таго, нашу каманду прадстаўлялі яшчэ тры мінскія школьнікі, якія не адсталі ад старэйшых таварышаў. Валерыя Каснерык заваявала "золата", а "срэбра" прывезлі Дзмітрый Дойнікаў і Андрэй Конанаў.

У алімпіядзе ўдзельнічалі навучэнцы з 11-ці краін СНД, Латвіі, Эстоніі, Румыніі і Балгарыі.

Беларуская каманда юных хімікаў – пастаянны ўдзельнік Мендзялееўскай алімпіяды. Аснову яе традыцыйна складаюць нашы ліцэісты.

Па словах кіраўніка каманды дацэнта хімічнага факультэта БДУ Аляксандра Рагойшы, сёлетняя каманда падабралася вельмі дружная, і атмасфера ў калектыве была амаль сямейнай, чаму паспрыяў і сумесны адпачынак у лагеры "Зубраня", куды трапляюць пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд па хіміі. Юнакі здолелі пацвердзіць свой узровень на алімпіядзе ў сакавіку гэтага года, па выніках якой і былі адабраны на спаборніцтвы ў Ташкент. Дарэчы, нашым юным талентам спакой толькі сніцца. Адразу пасля вяртання на радзіму яны ўключыліся ў 20-дзённы вучэбна-трэніровачны збор для падрыхтоўкі на Сусветную хімічную алімпіяду, што пройдзе ў чэрвені ў сталіцы Венгрыі. У Будапешце збяруцца прадстаўнікі ўжо з 70-ці краін. Зычым далейшых поспехаў!

Лэйла ІСМАІЛАВА

Каманда БДУ на 42-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе школьнікаў па хіміі.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

УРОК ЦАНОЮ ЛЁСАЎ

Студэнты БДУ адзначылі Дзень Перамогі.

Стар. 2

ШУКАЛЬНІК СКАРБАЎ ДРУКУ

Дацэнту кафедры гісторыі журналістыкі журфака БДУ Сцяпану ГОВІНУ споўнілася 70 гадоў.

Стар. 3

ЭЎРЫСТЫЧНАЯ МАТЭМАТЫКА

Выпускніца мехмата БДУ Аляксандра ЛУКІНА стала лаўрэатам гарадскога конкурсу педагогаў.

Стар. 4

"TIBO" ЗА НАМІ

Інфармацыйны партал Саюзнай дзяржавы *(www.soyuz.by)*, распрацаваны ЦІТ БДУ, заняў другое месца ў намінацыі "Інфармацыйны партал" на конкурсе інтэрнэт-праектаў на міжнароднай спецыялізаванай выставе "TIBO-2008".

Нашы інфармацыйныя прадукты ўжо другі год запар бяруць прызавыя месцы ў прафесійным конкурсе на лепшы інтэрнэт-рэсурс. Так, летась I месца заняў сайт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, створаны таксама спецыялістамі ЦІТ. На суіскканне сёлетняй прэміі прэтэндавалі больш за 700 веб-праектаў.

КАНФЕРЭНЦЫІ

БЕЛАРУСКА–ЯЎРЭЙСКІ ДЫЯЛОГ

28 красавіка ў БДУ прайшла Першая Міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуска-яўрэйскі дыялог у кантэксце сусветнай культуры".

У актавай зале вучэбнага корпуса БДУ на Кальварыйскай, 9 сабралася болей за 70 навукоўцаў з Беларусі, Расіі, Украіны і Ізраіля, а таксама маладыя даследчыкі – студэнты факультэта міжнародных адносін, якія спецыялізуюцца на габраістыцы.

На адкрыцці мерапрыемства выступіў рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Ізраіля Зееў Бэн-Ар'е. На пленарным і секцыйным пасяджэннях абмяркоўвалася шырокае кола праблем, звязаных з развіццём і ўзаемадзеяннем сусветнай, беларускай і яўрэйскай культур, іх тыпалогіяй і фенаменалогіяй.

Арганізатарам канферэнцыі выступіла кафедра культуралогіі факультэта міжнародных адносін БДУ пры дапамозе Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Беларусі, Ізраільскага культурна-інфармацыйнага цэнтра, Яўрэйскага агенцтва для Ізраіля ў Рэспубліцы Беларусь, Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і суполак.

дацэнт Галіна СІНІЛА,
загадчык кафедры культуралогіі ФМА БДУ

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

У ФОКУСЕ ЎВАГІ: АЎГУСТОЎСКІ КАНАЛ

28 красавіка ў Зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ адбылася прэзентацыя кнігі "Аўгустоўскі канал і сучасны экатурызм".

Гэта сумесны праект Белдзяржуніверсітэта і Гуманітарнай акадэміі імя А. Гейштора (Польшча) пры ўдзеле Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага і Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага універсітэтаў. У мерапрыемстве ўдзельнічалі кіраўнікі названых устаноў, а таксама прадстаўнікі пасольства Польшчы ў нашай краіне.

БДУ і Гуманітарная акадэмія імя А. Гейштора маюць стасункі ўжо 10 гадоў. Прафесары і навукоўцы дзвюх гэтых ВНУ і склалі аснову творчага калектыву кнігі, які ажыццявіў комплекснае даследаванне сучаснага стану і перспектыў развіцця экатурызму ў кантэксце праблем сістэмнай рэканструкцыі Аўгустоўскага канала. У кнізе тры раздзелы: "Устойлівае развіццё і сацыяльна-экалагічныя прыярытэты сучаснага экатурызму", "Аўгустоўскі канал і культурна-гістарычная спадчына народаў усходнееўрапейскага рэгіёна", "Аўгустоўскі канал як прыродна-экалагічны і сацыяльна-тэхнічны комплекс". Як заўважае навуковы рэдактар выдання доктар філасофскіх навук прафесар Анатоль Зелянкоў (БДУ), ідэя працягваць будаўніцтва ў зоне Аўгустоўскага канала з падключэннем у яго арбіту патэнцыйных магчымасцяў Днепра-Бугскага, Агінскага і Віндаўскага каналаў адкрывае сапраўды ўражальныя і захапляльныя перспектывы: стварэнне пан'еўрапейскай сістэмы каналаў, якія злучаць басейны Балтыйскага і Чорнага мораў у адзіную сацыяльна-экалагічную і турыстычную зону.

Варта адзначыць, што Аўгустоўскі канал – трансмежавы беларуска-польскі аб'ект, які прэтэндуе на ўнясенне ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Валянціна КЛЯНІЦКАЯ

Даведка

Аўгустоўскі канал уяўляе сабой сістэму водных шляхоў, рэк, азёр і спалучаных з імі суднаходных і водазборных шлюзаў, якія звязваюць рэкі Вісла і Нёман амаль да выхаду ў Балтыйскае мора. Свае вытокі ён бярэ на польскай тэрыторыі ў возеры Сервы ля горада Аўгустаў і праходзіць па землях Польшчы і Беларусі больш за 102 км.

Будаўніцтва канала вялося ў 1824–1839 гг. у Расійскай імперыі і было выканана па самых перадавых для таго часу тэхнічных стандартах і тэхналогіях. Пасля Другой сусветнай вайны польская частка канала (а яна цягнецца 80 км) была адноўлена і выкарыстоўвалася ў турыстычных мэтах. На беларускім баку рэстаўрацыйныя работы былі праведзены ў 2004–2006 гг. паводле ўказа кіраўніка дзяржавы.

ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

НАЛАДЖВАННЕ супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Універсітэтам Прэторыі (ПАР) стала тэмай сустрэчы ў Мінску 17 мая рэктараў абедзвюх ВНУ Васіля Стражава і Кэйлі Пісторыуса.

РЭКТАР БДУ прафесар Васіль Стражаў 14 мая сустрэўся з дэлегацыяй Вільнюскага універсітэта, якая наведала Белдзяржуніверсітэт на чале з прарэктарам Рымантасам Вайткусам. Былі абмеркаваны пытанні, звязаныя з далейшым двухбаковым партнёрствам, рэалізацыяй сумесных праектаў у галіне фундаментальных даследаванняў у межах дзеючага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж двума універсітэтамі. Госці сустрэліся таксама з кіраўніцтвам і выкладчыкамі хімічнага, біялагічнага і гістарычнага факультэтаў.

ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ на чале з рэктарам Васілём Стражавым наведала Лейпцыгскі універсітэт (Германія), дзе брала ўдзел у III Беларуска-нямецкім калёквіуме. Прарэктар Уладзімір Панькоў перадаў нямецкім калегам каля 15-ці адрасных прапаноў нашых навукоўцаў па сумесных даследаваннях у межах пагаднення аб супрацоўніцтве.

ПРАРЭКТАР БДУ па вучэбнай рабоце Уладзімір Клюня пабываў у шэрагу ВНУ Латвіі: Рыжскім тэхнічным універсітэце, Стакгольмскай школе эканомікі і Рыжскай школе бізнэсу. Ён сустрэўся з кіраўніцтвам і выкладчыкамі, з якімі абмеркаваў шляхі супрацоўніцтва БДУ і гэтых навучальных устаноў.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

УШАНАВАННЕ

"УРОК ЦАНОЮ ЛЁСАЎ"

Пад такой назвай 2–3 мая ў нашым універсітэце прайшла Міжнародная студэнцкая навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная падзеям Вялікай Айчыннай вайны.

Напярэдадні Дня Перамогі ў БДУ шанавалі сваіх ветэранаў.

У ёй бралі ўдзел 200 студэнтаў БДУ, а таксама расійскіх і ўкраінскіх ВНУ. Арганізатарамі форуму выступілі ваенны факультэт і ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю і моладзевыя арганізацыі БДУ.

Асноўнай мэтай гэтага мерапрыемства было выхаванне маральных каштоўнасцяў у маладога пакалення. У рамках навукова-даследчай секцыі "Унёсак беларускага народа ў перамогу над фашызмам" былі зачытаны лепшыя студэнцкія навуковыя працы на дадзеную тэму. Маладыя лідары абмяняліся досведам за круглым сталом "Роля моладзевых грамадскіх арганізацый у развіцці патрыятызму і грамадзянскасці сучаснай моладзі"і абмеркавалі будучыя сумесныя праекты ў гэтым накірунку. Праводзіліся таксама і два майстар-класы: па распрацоўцы сцэнарыяў моладзевых культурна-масавых мерапрыемстваў пад назвай "Вечны агонь памяці ў сэрцы" і па асвятленні ваенна-патрыятычнай тэматыкі ў студэнцкіх СМІ "Лісты з фронту" з удзелам начальніка аддзела ідэалагічнай работы газеты "Во славу Родины" Мікалая Ляўчука і спецыяльнага карэспандэнта АНТ Аляксея Міхальчанкі. Акрамя таго, творчыя асобы з ліку студэнтаў прадэманстравалі свае здольнасці падчас літаратурнага клуба "Ува мне спявае Перамогі слава".

На другі дзень мерапрыемства былі арганізаваны экскурсіі ў гісторыка-культурны комплекс "Лінія Сталіна" і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Акрамя таго, у рамках канферэнцыі Студсаюз БДУ арганізаваў фотамарафон пад назвай "Адгрукацела вайна, але засталася на сэрцы стоп-кадрам яна" з удзелам вядомага фатографа Юрыя Іванова.

Фотамарафон – гэта вельмі цікавае дзейства, напоўненае бурлівымі эмоцыямі, іскрыстымі ідэямі. Гэта вочы, якія гараць у пошуках кадра... Удзельнікі мерапрыемства за пэўны тэрмін павінны былі зрабіць цікавыя здымкі на прапанаваныя тэмы. І тут, як сведчыць практыка, зусім не важна, здымаеце вы прафесійна з дапамогай добрай тэхнікі ці вы толькі аматар з "лічбавікам" у руках. Галоўнае – жаданне і любоў да мастацтва.

Неабыякавых і творчых студэнтаў знайшлося багата, і гэта вельмі ўсцешыла майстра фатаграфіі. У выніку яго выбар спыніўся на наступных працах: "Жыццё цаною жыцця" і "45-ы кадр" (Алёна Сенькіна і Дзмітрый Лук'яненка), "Архітэктурны ордэн горада" (Вера Ярчынская), "63 мірныя гады" і "За кадрам Перамогі" (Уладзімір Каралёў), "Лёс чалавека" (Міхаіл Сіняўскі). Асобна былі адзначаны працы Дзяніса Пісарэнкі, Станіслава Савіцкага і Паліны Рабцавай.

Люба ЛЕАНОВІЧ
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

СВЯТКАВАННІ

АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

Школьныя алімпіяды вядомыя ўсім, і абітурыенты ўдзельнічаюць у іх з вялікай ахвотай не толькі дзеля будучага паступлення, але і для праверкі сваіх здольнасцяў і выпрабавання ўласных (фізічных, маральных) сіл. Важнае значэнне мае сам дух спаборніцтваў, які ахоплівае ўсіх, хто мае да іх дачыненне, і дае ім новыя стымулы.

Узнікае пытанне: чаму пры гэтым забываюцца на студэнтаў, якія таксама прагнуць паспаборнічаць ў інтэлектуальных гульнях? Кіраўніцтва фізічнага факультэта пайшло насустрач такому жаданню і ўзнавіла студэнцкую алімпіяду, якая апошні раз праводзілася ў 1974 годзе.

Галоўнымі яе арганізатарамі сталі выкладчыкі Міхаіл Сенюк і Леанід Бураў. Яны падрыхтавалі вельмі цікавыя і нестандартныя заданні, якія спадабаліся ўсім удзельнікам турніру.

Нягледзячы на тое, што адпаведную інфармацыю распаўсюджвалі толькі на фізічным факультэце, удзел у алімпіядзе бралі і іх калегі радыёфізікі. Чым не пацвярджанне карыснасці і займальнасці дадзенага мерапрыемства! Магчыма, ужо ў наступным годзе яно набудзе яшчэ большую масавасць і прыме да сябе не толькі студэнтаў БДУ, але і іншых ВНУ краіны.

КАЛІ ФІЗІКІ ГАРЭЗЫ...

Сёлета фізічнаму факультэту спаўняецца 50 гадоў. Таму праведзеныя 24–26 красавіка чарговыя XXXIV Дні фізіка сталі прадвеснікам надыходзячага свята. З гэтай нагоды арганізатары мерапрыемства істотна абнавілі святочную праграму.

Пачалося ўсё традыцыйнай прэс-канферэнцыяй з выкладчыкамі, пасля якой усім прысутным была прапанавана гульня "100 да 1", дзе каманды выкладчыкаў і студэнтаў мусілі "распазнаць" адказы на пытанні, дадзеныя студэнтамі філалагічнага факультэта, напрыклад: "Чым займаецца дэкан фізічнага факультэта?" або "Што носіць фізік у заплечніку?" У выніку з заданнем лепш справіліся маладыя, але і ім даволі цяжка даліся думкі гуманітарыяў.

Наступны дзень пачаўся ўсеагульным "зрывам" заняткаў, мітынгам і атракцыёнамі. Сярод апошніх разам з папулярнай стральбой па "кабанах", у якасці якіх выступілі чальцы аргкамітэта, і пуляннем з рагатак па фотаздымках любімых выкладчыкаў сёлета з'явіўся "спавядальны пакой", дзе студэнты маглі, не называючы сябе, атрымаць у дэкана "дараванне грахоў", напрыклад, за прагулы заняткаў. Пачыналася сакральная гутарка словамі: "Прабачце, ойча, я саграшыў...", і, натуральна, "грэшнікі" тут жа атрымлівалі індульгенцыю, а некаторыя ў дадатак – нават здаравенную чырвоную цагліну з парадай старанна "грызці граніт навукі".

Добраму настрою паспрыяў і аўкцыён, на якім студэнтам прапаноўваліся "ўсляпую" як рэчавыя лоты, так і залікі па прадметах. Раней найбольшай папулярнасцю карысталася фізпарыхтоўка, а зараз – залік па аўтаматызацыі фізічнага эксперымента.

Сёлета ўпершыню прайшлі спартыўныя спаборніцтвы паміж камандамі студэнтаў і выкладчыкаў. У валейболе відавочная перамога была на баку маладых, але ў футболе рэванш упэўнена ўзялі старэйшыя.

Галоўным момантам святочнай праграмы стаўся канцэрт, на арганізацыю якога аргкамітэт паклаў шмат часу і сіл. Усё пачалося з "ненаўмыснага" націску "забароненай" кнопачкі, пасля чаго ўвесь свет "перакуліўся", і віноўнікі мусілі выправіць сітуацыю. На сцэне разгортвалася мноства гісторый у самых розных інтэрпрэтацыях. Так, Гары Потэр з рэпрызы "Гісторыя аб гістарычнай несправядлівасці" памяняўся месцамі з Мальчышом Кібальчышом. Адной з асноўных сюжэтных ліній было перайначанае падарожжа Калабка, якое па-філасофску каментавалі казачныя героі. Праблематыка Калабка разглядалася з пяці бакоў: з пазіцый сацрэалізму (плячысты Калабок – барацьбіт за будучыню савецкага грамадства), студэнцкага тэатра (двое прачынаюцца з хворымі галовамі, а замест ежы і піцца – Калабок), Галівуда, японскага тэатра і інжынера канструктарскага бюро (прапанова мадэрновага выгляду Калабка).

Яшчэ адным займальным казусам стала інсцэнаванне сумеснага ўладарання ў Аўстраліі англійскай каралевы, рускай імператрыцы і егіпецкай царыцы. Цікава было даведацца, ці змогуць тры жанчыны дамовіцца і падзяліць між сабой вялікі кантынент, не пасварыўшыся і нічога не папсаваўшы.

Ну, а якое захапляльнае відовішча можа абысціся без бойкі і канкана! За аснову фізікі ўзялі сюжэт з фільма "Чалавек з бульвара Капуцынаў". Гэта варта было пабачыць! А завяршыла багаты на ўражанні святочны дзень дыскатэка.

Напрыканцы, 26 красавіка, адбыўся капуснік гасцей – прадстаўнікоў арганізацыйных камітэтаў сяброўскіх факультэтаў, які стаў сімвалічным закрыццём XXXIV Дзён фізіка.

Надзея КУХАРЧЫК

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

ФМА – THE BEST!

Каманда факультэта міжнародных адносін БДУ ў складзе студэнтаў IV курса па спецыяльнасці "Міжнароднае права" Арцёма Тозіка, Аліны Шакуцінай, Алесі Цябус (трэнер каманды – аспірантка кафедры міжнароднага права Алена Конава) атрымала перамогу ў III Нацыянальным спаборніцтве па міжнародным гуманітарным праве. Яго правёў 16–19 красавіка ФМА пры падтрымцы рэгіянальнай дэлегацыі Міжнароднага Камітэта Чырвонага Крыжа (МКЧК) ва Украіне, Беларусі і Малдове. Сёлета ўдзел у конкурсе бралі каманды 6-ці ВНУ Беларусі.

З сярэдзіны 1990-х гг. падобныя спаборніцтвы праводзяцца ў Расійскай Федэрацыі, Малдове, Украіне і іншых краінах СНД. Кожны конкурс збірае разам не толькі студэнтаў і выкладчыкаў ВНУ, але і спецыялістаў-практыкаў, якія працуюць у розных міжнародных і дзяржаўных арганізацыях.

***

28 красавіка ў Мінску прайшоў адборачны тур VII Міжнароднага конкурсу па кітайскай мове. У ім удзельнічалі студэнты з усёй рэспублікі, якія вывучаюць гэтую мову. Студэнты IV курса факультэта міжнародных адносін па спецыяльнасці "Лінгвакраіназнаўства" занялі ўвесь п'едэстал: Вольга Аўсеенка – I месца, Вераніка Карлюкевіч – II, Антон Беларусец – III. У выніку "залаты" і "срэбны" прызёры будуць прадстаўляць нашую краіну на Міжнародным конкурсе ў Пекіне ў ліпені 2008 года.

***

12 і 19 красавіка прайшоў адборачны тур і фінал VII Алімпіяды па турэцкай мове, якая праводзіцца таварыствам "Достлук" пры падтрымцы Пасольства Турэцкай Рэспублікі. Студэнткі III курса факультэта міжнародных адносін Вікторыя Трушко і Вольга Архіпенка занялі на алімпіядзе III і IV месцы адпаведна. Вікторыя Трушко разам з іншымі прызёрамі атрымала дыплом і запрашэнне на летнюю моўную стажыроўку ў Турцыю.

Падрыхтавала Наталля АТРАШКОВА

ПРЫЯРЫТЭТЫ БІЗНЭС-АДУКАЦЫІ

16–17 красавіка ў БДУ праходзіла VII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Актуальныя праблемы бізнэс-адукацыі", якую арганізаваў Інстытут бізнэсу і менеджменту тэхналогій.

Для ўдзелу ў канферэнцыі паступіла больш за 140 заявак з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі, Украіны, Балгарыі, ЗША і Францыі. Спецыялісты абмеркавалі пытанні выкарыстання тэхналогій дыстанцыйнага навучання ў бізнэс-адукацыі, а таксама актыўных метадаў навучання.

Удзельнікі дыскусій адзначылі тэндэнцыю да росту попыту на бізнэс-адукацыю на 15 % штогод, якая займае ўсё большую нішу на рынку адукацыйных паслуг. Аднак далейшае развіццё праграм МВА ў Беларусі стрымліваецца адсутнасцю стандарту па спецыяльнасці "Бізнэс-адміністраванне" па другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура). З гэтай прычыны вырашана паскорыць яго распрацоўку, пры гэтым прадугледзіць прафесійную накіраванасць навучання і падрыхтоўку спецыялістаў для інавацыйнай эканомікі.

У галіне інавацыйных метадаў навучання высокую эфектыўнасць мелі майстар-класы для выкладчыкаў бізнэс-школ, і таму рэкамендавана працягнуць практыку іх правядзення. Яшчэ ў мэтах павышэння ролі бізнэс-адукацыі ў развіцці інавацыйнай эканомікі неабходна стварыць нацыянальную бізнэс-школу, якая будзе працаваць на міжнародным узроўні. Гэта не толькі стане фундаментам беларускай сістэмы падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў, але і забяспечыць падрыхтоўку выкладчыцкіх кадраў, распрацоўку кейсаў, трэнінгавых сістэм і іншых кампанентаў, неабходных для сучаснага навучання.

Прафесар Уладзімір АПАНАСОВІЧ,
дырэктар ІБМТ БДУ

ЮБІЛЕІ

ШУКАЛЬНІК СКАРБАЎ ДРУКУ

Хоць журналісты ўвесь час шукаюць чагосьці "новенькага" і жывуць, як кажуць, толькі сённяшнім днём, у журналістыкі ёсць свая гісторыя. Даследуе, піша і выкладае яе ўжо 42 гады кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры журфка БДУ Сцяпан Говін. Ведаючы няўрымслівасць сваіх студэнтаў, ён не перастае нагадваць, што варта не толькі мець запал да ўсяго, што "падкідвае" жыццё, але і пакарпець над падзеямі мінулага. "Гісторыю трэбна ведаць, – кажа Сцяпан Васільевіч, – бо яна паўтараецца. Формы работы, метады, этыка журналісцкая – усё гэта вынайдзена і напрацавана да нас".

Сам ён заняўся гісторыяй пасля таго, як таксама некаторы час папрацаваў журналістам на магілёўскім абласным радыё і ў лагойскай раённай газеце "Ленінскі сцяг". На адзіную тады кафедру журналістыкі філфака прыйшоў у 1966 годзе і стаў яе сёмым па ліку выкладчыкам. Арганізацыя самога факультэта журналістыкі адбывалася на яго вачах. Менавіта ў гэты час Сцяпан Васільевіч абараніў дысертацыю "Дэмакратычны друк Заходняй Беларусі ў барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных". Адлік гісторыі

Сцяпан Говін знаёміць студэнтаў з гістарычным выданнем.

беларускай журналістыкі тады вёўся з 1925 года і звязваўся з выхадам газеты "Звязда". Аднак малады даследчык быў упэўнены, што мінулае нашых СМІ пачалося на некалькі стагоддзяў раней. Ён ўвёў у навуку паняцце пра першую беларускамоўную газету "Навіны грозныя а жаласлівыя..." на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. "Дарэчы, дата выхаду гэтага выдання была памылкова пазначана 1562 годам, хаця падзеі, якія ў ёй апісаны, адбываліся ў 1563 годзе, – распавядае Сцяпан Васільевіч. – Нашы друкаваныя выданні пачалі выходзіць значна раней, чым славутыя расійскія «Петровские ведомости» 1703 года. Аднак гаварыць аб гэтым стала магчымым толькі тады, калі наша краіна набыла незалежны статус". Сцяпан Говін як адзін з аўтараў першай праграмы "Гісторыі беларускай журналістыкі" ўпэўнены, што мінулае яшчэ і цяпер мае шмат "белых плям". Даследаванні ўскладняюцца тым, што ў нас не захаваліся многія камплекты газет і фактычна адсутнічаюць архівы тых часоў. Таму навукоўцам прыходзіцца ездзіць у Варшаву, Кракаў, Вільню, Львоў, Кіеў, нават у Каўнас, бо там можна знайсці рэдкія нумары беларускіх выданняў.

"Трапяткое пачуццё ўзнікае, калі ты трымаеш у руках газету даўніх часоў, тую ж «Нашу долю», «Нашу ніву», – распавядае Сцяпан Васільевіч і нават святлее з твару.– Гэта не толькі гісторыя, а і мастацкія творы, цудоўная публіцыстыка, розныя жанры, напрыклад, фельетон, памфлет, сатыра, карыкатура, якія сёння зніклі са старонак перыёдыкі... Газета – гэта першае, што пачалі друкаваць людзі для перадачы навін. Гэта прыкмета культуры, адукаванасці нацыі".

Даследчык цікавіцца і сённяшнімі выданнямі. Актыўна друкуецца. У "Настаўніцкай газеце", напрыклад, не так даўно выйшаў яго матэрыял пад назвай "Якія газеты былі першымі на Беларусі?" Мінулае і сучаснае звязаліся для выкладчыка ў адным жыцці...

Гэтымі днямі Сцяпан Васільевіч адсвяткаваў сваё 70-годдзе. Самая вялікая і патрэбная праца, якую юбіляр завяршыў якраз напярэдадні – гэта кніжка, вучэбна-метадычны комплекс "Канфесійны друк у Беларусі". Ужо гадоў восем ён чытае спецкурс пад такой назвай. І прапануе пачаць на факультэце падрыхтоўку журналістаў, якія будуць асвятляць канфесійнае жыццё ў Беларусі, ролю царкоўнай прэсы ў духоўным выхаванні чалавека, як гэта ўжо робіцца ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце.

"Сучасная журналістыка павінна быць больш духоўнай", – сцвярджае Сцяпан Говін.

Ганна ЛАГУН
Фота Сяргея КАХАЎЦА

Даведка

Кандыдат гістарычных навук Сцяпан Говін даследуе праблемы гісторыі, тэорыі і практыкі беларускай журналістыкі. Аўтар каля 200 навуковых прац, у тым ліку адной манаграфіі, трох падручнікаў (у сааўтарстве), двух вучэбна-метадычных комплексаў. Член Беларускага саюза журналістаў. Лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР. Узнагароджаны нагруднымі знакамі "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь" і "Выдатнік друку Беларусі". У сувязі з юбілеем Сцяпан Васільевіч атрымаў ганаровую грамату БДУ, а Бюро Сакратарыята БСЖ прысвоіла яму званне "Заслужаны журналіст Беларускага Саюза журналістаў".

ВЫСТАВЫ

ЭКСПАРТУЕМ АДУКАЦЫЮ

Дэлегацыя БДУ брала ўдзел у працы 7-й міжнароднай універсальнай выставы "Белы горад – Ашхабад" 23–25 красавіка ў сталіцы Туркменістана.

На стэндзе нашага універсітэта дэманстраваліся мультымедыйныя прэзентацыі факультэтаў, раздаваліся спецыяльна падрыхтаваныя інфармацыйна-рэкламныя буклеты з правіламі паступлення, а таксама анкеты для замежных абітурыентаў.

Будучыя туркменскія абітурыенты праявілі вялікую цікавасць да атрымання вышэйшай адукацыі ў нашым універсітэце. Дарэчы, на фоне іншых сярэднеазіяцкіх дзяржаў Туркменістан зараз дабіваецца сур'ёзных поспехаў у сацыяльна-эканамічным развіцці. У сувязі з гэтым узнікае пэўны кадравы попыт, які сістэма вышэйшай адукацыі гэтай краіны задаволіць не можа. Таму ў БДУ з'яўляецца рэальная магчымасць актывізаваць экспарт адукацыйных паслуг у дадзены рэгіён.

У межах візіту кіраўнік дэлегацыі БДУ Людміла Хухлындзіна сустрэлася з міністрам адукацыі Туркменістана Мухамедгельды Анаамавым, з якім абмеркавала пытанні, звязаныя з экспертызай перыядаў і зместу навучання ў сярэдніх школах гэтай краіны пры паступленні туркменскіх абітурыентаў на вучобу ў БДУ.

Аляксандр РЫТАЎ

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПРАЦА ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

24 красавіка ў Белдзяржуніверсітэце адбыўся чарговы студэнцкі "Кірмаш вакансій".

Пярвічная арганізацыя БРСМ БДУ праследуе гэтай акцыяй задачу падрыхтаваць моладзь да самастойнага выхаду на рынак працы, забяспечыць занятасць у вольны ад вучобы час, а таксама пазнаёміць студэнтаў з кампаніямі айчыннага рынку.

Прадпрыемствы ўсіх формаў уласнасці атрымалі магчымасць заявіць аб сваіх вакансіях, ажыццявіць персанальны падбор студэнтаў, пашырыць супрацоўніцтва з універсітэтам.

ІТ-рынак прадстаўлялі "Белхард Камп'ютэрс", Міжнародны дзелавы альянс "ІВА", даччынае прадпрыемства апошняга – "ІТ-парк".

Рынак будаўнічых паслуг і добраўпарадкавання прадставілі ЗАТ "Будсвет", Упраўленне дарожна-маставога будаўніцтва і добраўпарадкавання Мінгарвыканкама, ПУП "Чыстае святло".

Цікавасць да студэнтаў эканамічных спецыяльнасцяў у чарговы раз праявіў пастаянны ўдзельнік "Кірмашу" – АСБ "Беларусбанк".

Як павялося, гэтае мерапрыемства суправаджалі штотыднёвыя выданні "Работа для Вас", "Топ-персона", "Работа сегодня".

Найбольшым попытам і ўвагай у студэнтаў карысталіся кампаніі, якія прапануюць навучанне і працаўладкаванне за мяжой – "Бюро моладзевых праграм", інфармацыйна-кансультатыўная служба "Юніверс".

22 прадпрыемствы, больш за сотню вакансій, жывыя стасункі з работадаўцамі, мора інфармацыі пра рынак працы Беларусі, псіхалагічныя і юрыдычныя кансультацыі, анкетаванне і, нарэшце, працаўладкаванне – усё гэта студэнцкі "Кірмаш вакансій 2008".

Таццяна ГУРЭЦКАЯ

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Узнагароды ліцэістаў БДУ на 42-й Міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе па хіміі – БелТА, БелаПАН (13.05); "Рэспубліка" ("Хорошо нахимичили", 15.05); "Звязда" (16.05).

Гутарка з загадчыкам лабараторыі БДУ, доктарам хімічных навук прафесарам Дзмітрыем Грыншпанам – час. "Родная природа" № 3 ("О воде «живой» и «мертвой»").

Разважанні прафесараў мехмата БДУ Я. Радына і А. Мельнікава пра правядзенне ЦТ і прыёмнай кампаніі – "Звязда" ("Уступны экзамен, тэсціраванне: што мы атрымліваем і што губляем", 08.05).

Інтэрв'ю з прарэктарам па інфармацыйных тэхналогіях, дэканам ФПМІ Паўлам Мандрыкам – "Рэспубліка" ("Таланту нужны хороший педагог и... аура", 03.05).

Сустрэча студэнтаў біялагічнага факультэта БДУ з пісьменнікам Уладзімірам Ліпскім – "ЛіМ" ("Жаданы госць", 02.05).

Першая Міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуска-яўрэйскі дыялог у кантэксце сусветнай культуры" – БелаПАН, tut.by (28.04).

Перамога студэнткі БДУ Вольгі Яўсеенкі на адборачным туры Міжнароднага конкурсу "Кітайская мова – мост" – БелТА (28.04).

Другі адкрыты гарадскі фестываль моладзевых відэаролікаў "Кінагрань", галоўным арганізатарам якога з'яўляецца БДУ – "Настаўніцкая газета" ("Бязмежжа «Кінаграні»", 26.04).

Прэзентацыя кнігі "Аўгустоўскі канал і сучасны экатурызм" у БДУ – БелТА (25.04).

Псіхалагічна-прафесійнае тэсціраванне для абітурыентаў у БДУ – naviny.by ("Прививка верности для абитуриентов", 24.04); "7 дней" ("Собеседование: первый опыт", інтэрв'ю з дэканам ФМА Аляксандрам Шарапа, 08.05).

Кірмаш вакансій у БДУ – БелаПАН (23.04); БелТА, "Вечерний Минск" (24.04).

Першы адкрыты студэнцкі PR-форум "Папараць-кветка", арганізаваны журфакам БДУ – tut.by (22.04); "Минский курьер" ("Расцветает в апреле «ПаРРаць кветка»", 23.04); "Знамя юности" ("Профессия третьего тысячелетия", 25.04); "Вечерний Минск" ("Паргаць кветка", 30.04).

Дні фізфака БДУ – БелТА (22.04); "Минский курьер" ("Лекции не будет!", 24.04).

Гісторыя пра маладога спецыяліста, які скончыў БДУ і не застаўся на месцы працы па размеркаванні – "КП в Белоруссии" ("Выпускник вуза должен 8 тысяч долларов за неотработку по распределению", 22.04).

Міжнародная канферэнцыя "Фальклор і сучасная культура", арганізаваная філфакам БДУ – БелТА (21.04); "Минский курьер" ("Неувядаемый фольклор", 23.04).

Бронзавы медаль каманды БДУ на Чэмпіянаце свету па праграмаванні – "Знамя юности" ("Наши в «Битве интеллектов»", 18.04); "Рэспубліка" ("Победили интеллектом", 19.04); "СБ – Беларусь сегодня" ("По полной программе!", 30.04).

Распрацоўка НДІ ПФП БДУ і Гомельскага інжынернага інстытута МНС – Авіяцыйная сістэма кантролю над надзвычайнымі сітуацыямі – "Обозреватель" ("Небесный дозор", 18.04).

Узнагароды навукова-тэхнічных распрацовак БДУ на Маскоўскім міжнародным салоне інавацый і інвестыцый – "Звязда" ("Навукоўцы БДУ трымаюць «залатую» планку", 18.04).

Паспяховае выступленне навучэнцаў Юрыдычнага каледжа БДУ на тэатральна-лінгвістычным фестывалі "Omnes linguae", які прайшоў на базе Юркаледжа БДУ – "Звязда" ("Андрэй Малахаў «размаўляў» на англійскай мове", 18.04).

Для абітурыентаў Ліцэя БДУ заданні па біялогіі і рускай мове – "Репетитор", № 5.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

АБ'ЯВА

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: інтэлектуальных сістэм, міжнародных адносін, дызайну;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інфарматыкі, кібернетыкі, вышэйшай алгебры, функцыянальнага аналізу, міжнародных адносін, міжнародных эканамічных адносін, міжнароднага права, германскіх моў, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, менеджменту, дызайну, інфармацыйных тэхналогій;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: кібернетыкі, сістэмнага аналізу, фізікі, усходніх моў, міжнароднага права, германскіх моў, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, дызайну, інфармацыйных тэхналогій, менеджменту і арганізацыі аховы здароўя, агульнай і клінічнай псіхалогіі, агульнанавуковых дысцыплін;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: мытнай справы, міжнароднага турызму, германскіх моў, сучасных замежных моў, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, эканамічнай тэорыі, агульнанавуковых дысцыплін;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ фізікі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.

ДУА "ІНСТЫТУТ БЕСПЕРАПЫННАЙ АДУКАЦЫІ" БДУ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:

прафесарска-выкладчыцкага складу кафедраў:

нацыянальнай культуры і турызму:

- прафесар – 0,5;

даўніверсітэцкай падрыхтоўкі:

- выкладчык (гісторыя Беларусі + "Чалавек. Грамадства. Дзяржава") – 1,
- выкладчык (руская мова) – 1,
- старшы выкладчык (беларуская мова) – 1,
- старшы выкладчык (англійская мова) – 1,
- старшы выкладчык (Чалавек. Грамадства. Дзяржава) – 1,
- старшы выкладчык (руская мова) – 3,
- дацэнт (руская мова) – 1;

прыродазнаўства:

- выкладчык (матэматыка) – 1,
- старшы выкладчык (біялогія) – 1,
- старшы выкладчык (матэматыка) – 1,
- старшы выкладчык (хімія) – 1;

міжнацыянальных камунікацый:

- выкладчык (руская мова як замежная) – 5,
- старшы выкладчык (руская мова як замежная) – 9,
- дацэнт (руская мова як замежная) – 1.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, каб. 29; тэл. 222-82-68.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-НАВУЧАЛЬНЫ ЦЭНТР ФІЗІКІ ЧАСЦІЦ І ВЫСОКІХ ЭНЕРГІЙ БДУ (НЦ ФЧВЭ БДУ)

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА ЛАБАРАТОРЫІ фундаментальных узаемадзеянняў (2), электронных метадаў і сродкаў эксперымента (1).

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220001, г. Мінск, вул. М. Багдановіча, 153, каб. 206, А.П. Несцяровіч.

ДУА "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ інфармацыйных тэхналогій у адукацыі;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ моладзевай палітыкі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220001, г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, каб. 215; тэл. 200-91-07.

ВІНШУЕМ!

ЭЎРЫСТЫЧНАЯ МАТЭМАТЫКА

Аляксандра Лукіна, выпускніца механіка-матэматычнага факультэта БДУ стала лаўрэатам у намінацыі "Педагагічны дэбют" па выніках конкурсу прафесійнага майстэрства "Сталічны настаўнік – сталічнай адукацыі".

Гэты конкурс праводзяць Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі і Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама сярод студэнтаў выпускных курсаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, якія рыхтуюць спецыялістаў педагагічнага кірунку.

Аляксандра Лукіна хоць і аддае большую частку свайго часу вывучэнню такой складанай навукі, як матэматыка, але ў педагогіцы яна таксама "падкаваная". Да конкурсу яе рыхтавала выкладчыца кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ дацэнт Святлана Сірэнка. Аляксандра піша дыплом на тэму "Арганізацыйна-педагагічныя ўмовы рэалізацыі эўрыстычнага навучання на ўроках матэматыкі ў сярэдняй школе", навуковым кіраўніком якой з'яўляецца загадчык той жа кафедры дацэнт Вольга Жук.

У сваім эсэ на тэму "Дыялог з будучым вучнем", якое стала першым конкурсным выпрабаваннем, студэнтка напісала: "Твая школа – гэта школа радасці, а навучанне ў ёй асаблівае – эўрыстычнае. «Эўрыка» азначае выражэнне радасці, захаплення, задавальнення пры рашэнні якой-небудзь складанай задачы, з'яўленне ўдалай думкі, узнікненне новай плённай ідэі". І тут, па словах пераможцы, не абысціся без матэматыкі. Усё гэта Аляксандра і змагла прадэманстраваць на другім этапе конкурсу падчас правядзення ўроку ў незнаёмым класе. Сваёй любоўю да прадмета і ўменнем данесці веды студэнтка ўразіла ўсіх вучняў і журы, што і стала вырашальным момантам у прысуджэнні ёй звання пераможцы. Аляксандры, праўда, яшчэ давялося прайсці такія выпрабаванні, як "Візітоўка", дзе яна паказала сябе ў галіне педагогікі, а таксама "Сюрпрыз", падчас якога трэба было прадэманстраваць сваю педагагічную рэакцыю на пазаштатныя сітуацыі, што часта ўзнікаюць у любой школе. Да ўсяго, на педагагічным брэйн-рынгу прыйшлося адказаць на 14 пытанняў журы. З усімі заданнямі выпускніца мехмата ўдала справілася і стала першай сярод 68-мі ўдзельнікаў "Педагагічнага дэбюту" з сямі навучальных устаноў.

Ганна ЛАГУН

Найлепшы педагог-дэбютант Аляксандра Лукіна.

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

ВЫБРАЛІ НАЙЛЕПШАГА!

У мінулым месяцы былі падведзены вынікі конкурсу "Найлепшы педагог Студэнцкага гарадка БДУ".

Конкурс зладзілі ўпершыню з мэтай удасканалення і актывізацыі дзейнасці педагагічных работнікаў інтэрнатаў па дзвюх намінацыях: "Найлепшы сацыяльны педагог" і "Найлепшы педагог-арганізатар". Журы ўзначаліў прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Суворaў.

На адборачны этап суіскальнікі падавалі рэзюмэ (інфармацыйная даведка аб змесце, напрамках і метадах працы педагога), характарыстыку, складзеную загадчыкам інтэрната, і рабочы журнал. У фінал прайшлі чатыры сацыяльныя педагогі і тры педагогі-арганізатары.

Пры ацэнцы прафесійнай дзейнасці гэтых работнікаў улічваліся думкі студэнтаў, выказаныя ў адпаведным апытальніку. Вынікі апошняга паказалі, што насельнікі інтэрната ведаюць сваіх педагогаў і знаходзяцца з імі ў шчыльным кантакце.

У фінале конкурсу педагогі адвялі адкрытае мерапрыемства выхаваўчага характару і прадэманстравалі метадычныя распрацоўкі (сацыяльны пакет, сцэнарый і г.д.). Усе добра падрыхтаваліся, і таму аддаць каму-небудзь перавагу было цяжка.

Тым не менш, у намінацыі "Найлепшы сацыяльны педагог" перамагла Наталля Хацяневіч з інтэрната № 1, а ў намінацыі "Найлепшы педагог-арганізатар" – Алена Кізіневіч з таго ж інтэрната. Акрамя іх, лаўрэатамі конкурсу абвешчаны Ала Залеўская (сацыяльны педагог інтэрната № 6) і Наталля Шчарбакова (педагог-арганізатар інтэрната № 4).

Усім удзельнікам заключнага этапу былі ўручаны дыпломы і грашовыя прэміі.

Нашыя віншаванні і пажаданні творчых поспехаў!

Дырэкцыя
Студгарадка БДУ

КОНКУРСЫ

РАЗНАСТАЙНАСЦЬ КІНАМАСТАЦТВА

Грані куба ці піраміды лёгка падлічыць. А колькі іх у мастацтва?

Ёсць кіно дакументальнае і гульнёвае, ёсць сумнае і вясёлае, прафесійнае і аматарскае. Што такое кіно? Гэта чыйсьці свет, чыесьці думкі і эмоцыі, якія на пэўны час павінны стаць роднымі і гледачу.

Кіно бывае розным. Каб яго стварaць, хтосьці доўга вывучае тэорыю, а хтосьці адразу прыступае да практыкі, здымае як атрымліваецца і не баіцца вынесці на суд гледача свае спробы. Менавіта такія, аматарскія, але разам з тым шчырыя фільмы можна было пабачыць з 23 па 25 красавіка на адкрытым гарадскім моладзевым фестывалі відэаролікаў "Кінагрань", які ў другі раз арганізавала Грамадская інфармацыйная служба Студгарадка БДУ пры падтрымцы аддзела па справах моладзі Мінгарвыканкама.

Маладыя рэжысёры імкнуліся па-новаму зірнуць на традыцыйныя для грамадства тэмы любові, сям'і, здароўя, аховы навакольнага асяроддзя. Усяго было заяўлена больш за 130 арыгінальных прац.

Усіх удзельнікаў фестывалю можна было адразу назваць пераможцамі, паколькі іх творы ўжо пабачылі свет і адгукнуліся ў сэрцах гледачоў. Паказы ў кінатэатры "Цэнтральны" і ў відэакомплексе "Цэнтр-відэа" праходзілі з аншлагамі. Сустрэча з рэжысёрам Станіславам Гайдуком у Клубе дакументальнага кіно, майстар-класы вядомых спецыялістаў – аператара Паўла Ценіна і рэжысёра АТН Сяргея Рыбакова з Белтэлерадыёкампаніі – дадалі прафесійных ведаў у творчую скарбонку. Гэты досвед дапаможа зрабіць карціну, нават кароткаметражную, вартай увагі гледачоў. Разам з тым на такіх фестывалях, як "Кінагрань", ёсць магчымасць ацаніць сваю працу пры параўнанні са шматлікімі відэаролікамі іншых аўтараў. Нездарма ж кажуць: "Усё пазнаецца ў параўнанні". Творчыя працы, адзначаныя кампетэнтным журы, можна лічыць за творчы арыенцір. Журы фестывалю – гэта людзі, якія глыбока вераць у магію кіно, валодаюць прафесійным чуццём у мастацтве: Генадзь Давыдзька, Сяргей Кацьер, Ігар Сукманаў, Людміла Перагудава, Сяргей Рыбакоў, Уладзімір Макарэвіч і інш. Паводле іх рашэння Юрый Ярошык з БДАТУ быў ганараваны Гран-пры фестывалю за відэаролік "Мелодыя маёй душы". Фільм "Адкрый вусны твае за нямога і для абароны ўсіх сірот" Вольгі Бяляевай з Варонежа ацанілі не толькі спецыялісты, але і гледачы. Гэты відэаролік перамог адразу ў дзвюх намінацыях – "Найлепшае дакументальнае кіно" і "Прыз глядацкіх сімпатый".

Начальнік аддзела па справах моладзі Мінгарвыканкама Віталь Брэль і дырэктар Студгарадка БДУ Міхаіл Чарапеннікаў на адкрыцці фестывалю.

На фестывалі ўсе маглі адчуць і зразумець, што кіно бывае розным і толькі добрае зачараўвае, інтрыгуе, пашырае межы ўспрымання навакольнага свету.

Юлія ХМЯЛЕЎСКАЯ

СПАБОРНІЦТВЫ

У СПАРТЫЎНЫМ ЗАПАЛЕ

Ушанаванне прызёраў 55-й спартакіяды сярод студэнтаў адбылося 29 красавіка ў актавай зале Ліцэя БДУ.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі універсітэцкае кіраўніцтва, дэканы ўсіх факультэтаў, а таксама вядомыя спартоўцы і артысты беларускай эстрады. Узнагароды размяркоўваліся па наступных відах спорту: гіравы спорт, спартыўная аэробіка, лёгкаатлетычны крос, футбол, лыжны спорт, грэка-рымская барацьба, дзюдо, каратэ, плаванне, армрэслінг, паўэрліфтынг, настольны тэніс, а таксама баскетбол і валейбол сярод жаночых і мужчынскіх камand. Пасля падвядзення агульных вынікаў I месца дасталася зборнай юрыдычнага факультэта, II – механіка-матэматычнага, III – геаграфічнага. Акрамя таго, былі абвешчаны лаўрэаты ў асобных намінацыях: найлепшым трэнерам прызнаны выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Віктар Красільнікаў, трэнерам-арганізатарам – Людміла Капылова; найлепшымі спартоўцамі сталі студэнты III курса гістарычнага факультэта – удзельніца зімовых Алімпійскіх гульняў у Турыне Вольга Васілёнак і майстар спорту па грэка-рымскай барацьбе Міхаіл Сямёнаў, а таксама студэнт IV курса эканамічнага факультэта, срэбны прызёр Чэмпіянату свету па паўэрліфтынгу (неалімпійскі від) Аляксей Кашпей.

Арганізатарам свята з'яўляецца Спартыўны клуб БДУ пры падтрымцы прафкамаў супрацоўнікаў і студэнтаў, а таксама ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю.

Вольга МАЛЫХІНА

КАНЦЭРТЫ

ХАРАВОЕ ПАРАЗУМЕННЕ

1–3 мая ў Белдзяржуніверсітэце адбыўся III Міжнародны форум студэнцкіх хароў "Папараць-кветка", у якім выступілі 8 калектываў з Расіі, Польшчы і Беларусі.

У першы і заключны дзень для ўдзельнікаў мерапрыемства даваў вакальна-харавыя майстар-класы дацэнт кафедры дырыжыравання Расійскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя А.І. Герцэна, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Ігар Мацюхоў. 2 мая адбылася прэс-канферэнцыя і канцэрт у Ліцэі БДУ.

Асноўны канцэрт прайшоў 3 мая ў САК БДУ "Брыганціна". Менавіта тут, на прыродзе, як лічаць арганізатары (упраўленне па справах культуры), і пацвярджаюць удзельнікі папярэдніх форумаў, ствараецца найбольш цёплая творчая атмасфера і харавыя спевы гучаць асабліва пранікнёна.

Гэтае свята песні садзейнічала развіццю добрых традыцый беларускай і сусветнай харавой творчасці, а таксама наладжванню творчых сувязяў і кантактаў паміж калектывамі трох краін.

Андрэй РЫНДА

ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

Пра конкурсы прыгажосці "Міс Журфак" і "Міс Гумфак", культурна-аздараўляльную шоу-праграму «Прафсаюз і студэнцтва разам», прысвечаную Міжнароднаму дню салідарнасці моладзі ў Мінскім лядовым палацы спорту, сустрэчу рэктара БДУ з першакурснікамі Юрыдычнага каледжа і юрыдычнага факультэта, а таксама шмат іншых цікавых матэрыялаў чытайце на сайце нашага выдання

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

20 мая 2008 года
Падпісана да друку 19.05.2008 г.
Зак. 509. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by